# ПОЛАЦКАЯ АПЕРАЦЫЯ
# (29 ЧЭРВЕНЯ – 4 ЛІПЕНЯ 1944)

**Полацкая аперацыя** (29 чэрв. – 4 ліп. 1944), наступальная аперацыя войск 1-га Прыбалтыйскага фронту (ген. арміі І. Х. Баграмян), састаўная частка Беларускай аперацыі 1944.

Удзельнічалі: арміі 4-я ўдарная (генерал-лейтэнант П. Ф. Малышаў), 6-я гвардз. (генерал-палкоўнік І. І. Чысцякоў), 43-я (генерал-лейтэнант А. П. Белабародаў), 3-я паветр. (генерал-лейтэнант авіяцыі М. П. Папівін), 1-ы танк. корпус (генерал-лейтэнант танк. войск В. В. Буткоў).

Мэта аперацыі – разгром полацкай групоўкі праціўніка і вызваленне г. Полацк. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту, якія разам з 3-м Беларускім фронтам завяршылі Віцебска-Аршанскую аперацыю 1944, у адпаведнасці з пастаўленай Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання задачай, прыступілі без аператыўнай паўзы да ажыццяўлення Полацкай аперацыі. Савецкім войскам процістаялі злучэнні 16-й арміі групы армій «Поўнач» і частка сіл 3-й танкавай арміі групы армій «Цэнтр». Нямецка-фашысцкае камандаванне ператварыла Полацк у магутны вузел абароны. На падыходах да яго абарончы рубеж (кодавая назва «Пантэра») праходзіў у палосе азёр і балот, меў развітую сістэму палявых, месцамі доўгачасовых умацаванняў, тут была сканцэнтравана групоўка ў складзе 6 пяхотных дывізій, горад быў падрыхтаваны да кругавой абароны. План савецкага камандавання прадугледжваў ударамі па збежных напрамках з ПнУ і ПдЗ акружыць і знішчыць полацкую групоўку праціўніка. 29 чэрвеня савецкія войскі перайшлі ў наступленне. Галоўны ўдар наносілі войскі 4-й ударнай арміі ў напрамку на Катляны, Пазднякі, Дахнар, правафланговыя злучэнні 6-й гвардзейскай арміі ажыццяўлялі абход Полацка з ПдЗ, 1 ліпеня яны выйшлі да ўсходніх і 3 ліпеня да паўдёвых ускраін горада. Пасля жорсткіх двухдзённых баёў Полацк да раніцы 4 ліпеня быў вызвалены. Войскі левага крыла фронту – асноўныя сілы 6-й гвардзейскай арміі разам з войскамі 43-й арміі – разгарнулі 29 чэрвеня наступленне ў напрамку Глыбокае, Казяны. Адначасова часці 1-га танкавага корпуса імклівым ударам 29 чэрвеня вызвалілі райцэнтр г. п. Ушачы і, пераадолеўшы каля 30 км цяжкапраходнай мясцовасці, у той жа дзень сіламі 2 (мотастралк. і танк.) брыгад авалодалі райцэнтрам в. Ветрына. Часці 159-й танкавай брыгады 1-га танкавага корпуса 30 чэрвеня раптоўна ўварваліся на вуліцы г. Дзісна, праследуючы праціўніка, які адступаў, захапілі на правым беразе Заходняй Дзвіны плацдарм і разам з воінамі 154-й стралк. дывізіі 6-й гвардзейскай арміі ў выніку ўпартых баёў 4 ліпеня вызвалілі г. Дзісна. Злучэнні 2-га стралковага корпуса 6-й гвардзейскай арміі і войскі 43-й арміі перарэзалі чыгунку Полацк – Маладзечна і выйшлі на рубеж Германавічы – Пліса – Беразіно. Часці 1-га танкавага корпуса фарсіравалі р. Мнюта, у ходзе наступлення ўдзельнічалі ў вызваленні райцэнтраў: разам з часцямі 6-й гвардзейскай арміі 1 ліпеня вызвалілі г. п. Шаркаўшчына, разам з войскамі 43-й арміі 2 ліпеня – в. Пліса. 3 ліпеня – г. Глыбокае; войскі 43-й арміі разам з воінамі 10-й асобнай гвардзейскай танкавай брыгады 2 ліпеня вызвалілі г. Докшыцы. У вызваленні Глыбокага ўдзельнічалі партызаны брыгады «Кастрычнік», у вызваленні Докшыц – брыгады «Жалязняк». Праследуючы праціўніка, войскі левага крыла фронту прасунуліся на 3 амаль на 110 км і да зыходу 4 ліпеня выйшлі на рубеж Опса – Казяны – воз. Нарач. Пасля ліквідацыі полацкай групоўкі праціўніка савецкія войскі атрымалі магчымасць наступаць па абодвух берагах Заходняй Дзвіны ў напрамку на Дзвінск (Даўгаўпілс). Войскі фронту дзейнічалі на стыку 2 груп нямецка-фашысцкіх армій, у ходзе аперацыі ізалявалі іх адну ад адной, не далі магчымасці групе армій «Поўнач» прыйсці на дапамогу войскам

групы армій «Цэнтр», надзейна забяспечылі з Пн наступленне галоўнай стратэгічнай групоўкі савецкіх войск на Беларусі. 31 злучэнню і часці, якія вызначыліся ў аперацыі, нададзены ганаровыя найменні «Полацкіх».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Андрукович, Е. Е.** Полоцкая наступательная операция 1944 года / Е. Е. Андрукович // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета / Министерство образования Республики Беларусь, Полоцкий государственный университет ; редкол.: Д. Н. Лазовский (гл. ред.) [и др.]. – Новополоцк, 2008. – Вып. 28 : Гуманитарные науки. – С. 64–68.

2. **Баграмян, И. Х.** Командую фронтом / И. Х. Баграмян // Так мы шли к победе / И. Х. Баграмян. – М. : Воениздат, 1988. – С. 424–440.

3. **Беларусь** у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 502.

4. **На полоцком** направлении // По приказу Родины / авторы: И. М. Чистяков [и др.] ; под ред. Н. П. Ваганова. – М. : Воениздат, 1971. – С. 147–169.

5. **Полацкая** аперацыя 1944 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1999. – Т. 5. – С. 529–530.